**Мандрык, І.** «КІМаўцы» / І. Мандрык // Чырвоная змена. – 1969. – 5 чэрв. – С. 2.

# «КІМАЎЦЫ»

**У часы ваеннага ліхалецця «Чырвоная змена» паведамляла аб адной жорсткай схватцы з ворагам партызанскага атрада «КІМ», які дзейнічаў на тэрыторыі цяперашняга Верхнядзвінскага раёна. «Бой на пераправе» – так называлася карэспандэнцыя.**

**Я сустракаўся з былым начальнікам штаба гэтага атрада Уладзімірам Уласавічам Гарадзеем. Працуе ён аграномам там, дзе і ваяваў. Перад дваццацігоддзем Перамогі над гітлераўскімі захопнікамі адважны партызан узнагароджан ордэнам Леніна.**

**Аб баявых буднях атрада хочацца расказаць сённяшнім чытачам «Чырвонай змены».**

Цяжкі і трывожны быў час. Вораг кальцом акружаў Ленінград, знаходзіўся ля падножжа Каўказа, ірваўся да Волгі.

Моладзь з вёсак Юзафоўскага, Галубаўскага, Дзёрнавіцкага і іншых сельскіх Саветаў былога Дрысенскага раёна, аб'яднаная ў партызанскі атрад «КІМ», усімі сіламі імкнулася дапамагчы Радзіме ў барацьбе з заклятым ворагам.

Са смельчакоў былі створаны баявыя групы. Яны накіраваліся пад Полацк, дзе з-пад носа ворага выносілі вінтоўкі, цынкавыя бляшанкі з патронамі, гранаты, капсулі для мін. Неўзабаве вярнуліся людзі, якія хадзілі за лінію фронту. Атрад захапіў мінамёты, супрацьтанкавыя ружжы, снайперскія вінтоўкі, аўтаматы.

Партызаны пачалі «паляваць» на гітлераўскіх бандытаў. Атакавалі варожы абоз каля вёскі Барадуліна. Суправаджаючыя яго ваякі разбегліся хто куды, а ўвесь правіянт трапіў на базу атрада. Аперацыю правёў Дзіма Яскевіч. Ён прабраўся ў варожы гарнізон і адтуль прыцягнуў «языка».

Усё часцей выходзілі мсціўцы на чыгуначную магістраль Бігосава – Полацк. Там, дзе шанцавала, пускалі пад адхон паязды, якія ішлі да фронту, узрывалі масты, рэйкі. Аднойчы Барыс Шчарбакоў прапанаваў правесці рэйд у заходнія раёны. Ён узначвліў групу камсамольцаў. Вярнуліся хлопцы ў атрад, запісаўшы на свой баявы рахунак спушчаны пад адхон эшалон, некалькі разбураных шасейных мастоў. Імі быў знішчаны ваенны камендант гарнізона ў мястэчку Опса.

Удары народных мсціўцаў занепакоілі ворага. Акупацыйныя ўлады пачалі збіраць сілы супраць партызан. У адну з марозных раніц (гэта было ў лютым 1943 года) карнікі нечакана праніклі да вёсак Клімаўшчына і Белавусы. Падцягнулі туды тры гарматы, кулямёты.

Першымі завязалі бой з ворагам партызанскія разведчыкі. Да падыходу асноўных сіл яны адбівалі атакі гітлераўцаў. Вораг абрушваў на смельчакоў шквал кулямётнага агню, біў з артылерыі. У вёсцы Клімаўшчына пачаўся пажар.

Раптам з двух канцоў вёскі Ярмакі, дзе знаходзіліся карнікі, пракацілася грознае «Ура!». Гэта кінуліся на ворага партызаны-«кімаўцы». Вораг не выстаяў, у паніцы адступіў.

Вёскі Ярмакі, Клімаўшчына, Белавусы не раз потым былі месцамі жорсткіх боек.

Неяк летам у Боркавічы прыбыло многа гітлераўскіх салдат. Фашысты размясціліся ў вёсках Краўцы, Капытавіна, Княжыцы, Антонава. Партызанская разведка ўстанавіла, што гэта зняты з фронту пяхотны полк. Вораг меў намер ачысціць ад партызан вялікую тэрыторыю. Увесь пярэдні край гэтай тэрыторыі знаходзіўся пад кантролем атрада «КІМ». Значыць, «кімаўцам» першымі і пачынаць.

Партызаны занялі абарону на рубяжы вёсак Ярмакі, Клімаўшчына, Белавусы. Пры дапамозе насельніцтва выкапалі акопы. Вораг пачаў артылерыйскую падрыхтоўку.

Некалькі дзён ішоў бой. У лабавых атаках фашысты поспеху не дабіліся, вырашылі ўдарыць з фланга. Але і гэта не ўдалося. Задумы ворага былі развеяны смелымі дзеяннямі партызан у баі, аб якім і расказваюць пажоўклыя старонкі «Чырвонай змены».

**«… Карнікі не адважыліся ў першы дзень ісці на пераправу. Іх добра «пачаставалі» свінцом дазорныя. Уся эпапея адбылася 2 чэрвеня. Партызаны, разгадаўшы задуму ворага, ноччу ўпотай занялі старыя акопы над самай ракой, замаскіраваліся там. Кулямётны ўзвод з чатырма «станкачамі» размясціўся на ўскрайку лесу. Падаспелі артылерысты з суседняга атрада імя Калініна.**

**Надышла раніца, Вораг адразу рушыў да пераправы. Тут жа яго перадавыя парадкі накрылі снарады, выпушчаныя з 122-міліметровай партызанскай гарматы.**

**Некалькі разоў вораг імкнуўся перабрацца цераз раку. І кожны раз яго спынялі мужныя дзеянні лясных салдатаў. Калі сонца паднялося пад поўдзень, карнікі вымушаны былі адступіць. Падабралі сваіх раненых і забітых – і нацянькі ў свой гарнізон.**

**Партызаны перамаглі».**

Многа такіх баявых эпізодаў значыцца ў летапісе дзейнасці камсамольскага партызанскага атрада. Народныя мсціўцы-«кімаўцы» ні на адзін дзень не пакідалі ворага ў спакоі.

**І. Мандрык,**
**былы партызан**